А малы каляднічак пагуляць ахвотнічак!

О-го-го! – якое гэта чаканае, прыцягальнае і ўвогуле ні з чым не параўнальнае свята – Каляды. І калі ў людзей сталага веку яно перш за ўсё атаясамліваецца з прымеркаваным да такой нагоды грунтоўным і шчодрым сталом, то для моладзі – з заліхвацкімі гульнямі і санным вяселлем, для дзятвы – з елачнымі забавамі і дзедмарозаўскімі пацешкамі. Але, як не кажы, агульны настрой вызначаны для ўсіх канчаткова і беспаваротна.

Блізка Каляды.
Усе людзі рады:
Япручкі смаляць
І Бога хваляць.

І само сабой, Каляды як свята ў гонар Новага года заўсёды несла і, як можа, прадаўжае несці ўсяму люду ўслаўленне прыродных дароў, багацця чалавечай існасці і духоўнага здароўя. Яно спакон веку мела пры сабе ўхвальную песню і старанна распрацаваны народны абрад з досціпамі і штукарствам. Як, да прыкладу, тое ж незабыўнае каледаванне. Падчас яго маладыя хлопцы і дзяўчаты з віншавальнымі спевамі гурмой ходзяць па вуліцах і нясуць землякам пажаданні здабыткаў у хаце і хляве, плёну ў полі і спору ў любові. Калядоўшчыкі, або як іх яшчэ называюць каляднікі, часцяком водзяць за сабой адпаведна пераапранутага свайго хаўрусніка, якога зазвычай завуць «казой».

Дык вось адна тая непаўторная «каза» чаго толькі варта!

Дзе каза рогам –
Там жыта стогам.
Дзе каза хвастом –
Там жыта кустом.
Дзе каза нагою –
Там жыта капою.

Неверагодна, але, як кажуць, факт! Ці не таму калядоўшчыкаў і заклікалі, і ўшаноўвалі, і частавалі. Можа, падобнае і здасца каму-небудзь нейкай паблажлівай архаікай, маўляў, «чым бы дзіця не цешылася, абы не плакала», але раім не спяшацца з прысудам.

Ужо колькі год запар калядуюць на святы ў Гродна вядомыя нават у Францыі, Польшчы, Нарвегіі «Дударыкі» на чале са сваім завадатарам Яўгенам Петрашэвічам. Шкада толькі, што іх, гэтых два дзесяткі хлопчыкаў і дзяўчынак, у тым падзвіжніцтве можа яшчэ толкам недаацанілі. А ў гэтым годзе ва ўзорнага ансамбля з абласнога Дома дзіцячай і юнацкай творчасці праграма Калядак прыемна абноўленая. Бо, як вядома, калядныя песні ў сваёй большасці, а то цалкам, складаюцца з народнага зместу. А тут Яўген Канстанцінавіч прапанаваў сваім выхаванцам больш дзесятка песень-калядак, якія стварыў з уласных слоў і музыкі. Амаль не здзіўлюся, што гэта бадай адзінкавы на сёння ў Прынёманні (а можа, рэспубліцы?) выпадак. А ён варты пільнай увагі яшчэ таму, што Я.Петрашэвіч падрыхтаваў зборнічак, дзе суседнічаюць, і даволі памяркоўна, тэксты народныя і петрашэвічавы. Ён цалкам гатовы да выдання! Застаецца толькі на ўсю калядную моц выгукнуць: «А-у! Спон-са-ры, дзе вы?..»

Але ва ўсякім разе, што б там не было, чакаем «Дударыкаў»-калядоўшчыкаў, не забываючы: «А малы каляднічак пагуляць ахвотнічак!»

Юры ГОЛУБ.

НА ЗДЫМКУ: калядоўшчыкі з Я.ПЕТРАШЭВІЧАМ.

Словы і музыка Я. ПЕТРАШЭВІЧА

Ідзе, ідзе Каляда

Ідзе, ідзе Каляда
Ад сяла і да сяла.
Прыпеў:
Весяліся, дружына,
І не змерзне чупрына.



ным вяселлем, для дзятвы – з елачнымі забавамі і дзедмарозаўскімі пацешкамі. Але, як не кажы, агульны настрой вызначаны для ўсіх канчаткова і беспаваротна.

Блізка Каляды.
Усе людзі рады:
Япручкі смаляць
І Бога хваляць.

І само сабой, Каляды як свята ў гонар Новага года заўсёды несла і, як можа, прадаўжае несці ўсяму люду ўслаўленне прыродных дароў, багацця чалавечай існасці і духоўнага здароўя. Яно спакон веку мела пры сабе ўхвальную песню і старанна распрацаваны народны абрад з досціпамі і штукарствам. Як, да прыкладу, тое ж незабыўнае каледаванне. Падчас яго маладыя хлопцы і дзяўчаты з віншавальнымі спевамі гурмой ходзяць па вуліцах і нясуць торная «каза» чаго толькі варта!

Дзе каза рогам –
Там жыта стогам.
Дзе каза хвастом –
Там жыта кустом.
Дзе каза нагою –
Там жыта капою.

Неверагодна, але, як кажуць, факт! Ці не таму калядоўшчыкаў і заклікалі, і ўшаноўвалі, і частавалі. Можа, падобнае і здасца каму-небудзь нейкай паблажлівай архаікай, маўляў, «чым бы дзіця не цешылася, абы не плакала», але раім не спяшацца з прысудам.

Ужо колькі год запар калядуюць на святы ў Гродна вядомыя нават у Францыі, Польшчы, Нарвегіі «Дударыкі» на чале са сваім заводатарам Яўгенам Петрашэвічам. Шкада толькі, што іх, гэтых два дзесяткі хлопчыкаў і дзяўчынак, у тым падзвіжніцтнага зместу. А тут Яўген Канстанцінавіч прапанаваў сваім выхаванцам больш дзесятка песень-калядак, якія стварыў з уласных слоў і музыкі. Амаль не здзіўлюся, што гэта бадай адзінкавы на сёння ў Прынёманні (а можа, рэспубліцы?) выпадак. А ён варты пільнай увагі яшчэ таму, што Я.Петрашэвіч падрыхтаваў зборнічак, дзе суседнічаюць, і даволі памяркоўна, тэксты народныя і петрашэвічавы. Ён цалкам гатовы да выдання! Застаецца толькі на ўсю калядную моц выгукнуць: «А-у! Спон-са-ры, дзе вы?..»

Але ва ўсякім разе, што б там не было, чакаем «Дударыкаў»-калядоўшчыкаў, не забываючы: «А малы калядзнічак пагуляць ахвотнічак!»

Юры ГОЛУБ.

НА ЗДЫМКУ: калядоўшчыкі з Я.ПЕТРАШЭВІЧАМ.

Словы і музыка Я. ПЕТРАШЭВІЧА

Ідзе, ідзе Каляда



Ідзе, ідзе Каляда
Ад сяла і да сяла.
Прыпеў:
Весяліся, дружына,
І не змерзне чупрына.

А малы калядзнічак
Пагуляць ахвотнічак.
Прыпеў.
А яму, нібы смяшком,
Вушкі мы натром сняжком.
Прыпеў.
Не бярэ яго мароз,
Снег марозіць шчочкі, нос.
Прыпеў.

Ідзе, ідзе Каляда

Словы і музыка Я.Петрашэвіча